Тыднёвік Магілёўскі

№ 18 (18)
5.09.97.



“Адзін ратнік праўдзівы пагоніць сотню непраўдзівых...”

У той верасnёвы дзень 1514 года 30-тысячнае Беларуска-літоўскае Войска пад кіраўніцтвам гетмана Канстанціна Астрожскага на беразе рачулкі Крапіўны ўшчэнт разбіла 80-тысячную армію маскоўскага князя Васіля. Тым самым тагачасная беларуская дзяржава ўратавалася ад чужынскай акупацыі, захавала свабоду, пазбегла рабаўніцтва. На жаль, не надта надоўга. Масковія ніколі не грэбавала магчымасцю пашырыць свае ўладанні і павялічыць багацце за кошт суседзяў. Беларусы цярпелі ад "славянскай праваслаўнай сястры" найбольш за іншых...

Таму той, хто любіць сваю краіну, справядліва лічыць гэты дзень — 8 верасня найвыдатнейшым днём роднай гісторыі і непагасным у вяках Днём беларускай вайсковай славы. Той, хто не ведае і не хоча ведаць гісторыі, для каго роднага краю не існуе без нібыта "вечнай дружбы" з расейскім суседам — той лічыць гэты дзень прыдумкай беларускіх "нацыяналістаў".

Але ж дзень пераможнай для беларусаў бітвы пад Воршай праславіў у летапісу сучасны праваслаўны "хранікёр" таго часу, шчыра адзначыўшы гэты подзвіг барацьбітоў за свабоду. У старадаўнім пісьмовым паданні занатавана:

"За пакаранне зла людзей і многія іх няпраўды праліецца кроў іх, як вада вялікая... Адзін ратнік праўдзівы пагоніць непраўдзівых 100, а ад сотні загіне 1000 і плоць іх будзе на ежу жывёлам і птушкам, і косці іх на пазор усякай жывёле... Цяпер тым прароцтвам узнагародзіў Бог князя Канстанціна, надвышэйшага гетмана Літоўскага, што яго справаю і яго смелага сэрца і рукі сягненнем людзі маскоўскага ворага пабілі і тых забітых плоці зверы і птушкі ядуць... Князю Канстанціну дай Божа здароўе і шчасце наперад лепшае, як цяпер пабіў сілу вялікую маскоўскую, каб так пабіваў моцную рaць татарскую, праліваючы кроў іх басурманскую..."

Мы знайшлі гэтае спагадлівае апісанне бітвы пад Воршай, пра якую народ складаў песні, у кнізе "Полное собрание русских летописей", выдадзенай у 1980 годзе ў Маскве. Але і без летапісу народ у вусным пераказе і ў песнях вякамі захоўваў памяць пра вайсковы подзвіг беларускага гетмана са сваімі мужнымі ратнікамі.

У нармальнай краіне з гэтага пачынаўся б першы ўрок кожнага навучальнага года. Такое, на жаль, сёння немагчыма. Але ж гісторыя не спыніла сваёй хады. Дзень Восьмага Верасня яшчэ зойме сваё пачэснае месца ў нашым дзяржаўным календары.

Т.ТУТЭЙШЫ,
гісторык.





Здымак, на якім “галова Леніна”, быў апублікаваны намі ў 16-м нумары ТМ. Тады ж мы выказалі сваю версію знікнення часткі цэментнай фігуры. Аднак нашая здагадка аб тым, што галову пакінулі дзеля таго, каб на ёй устанавіць “верх” сённяшняга беларускага правадыра, не пацвердзілася. Цяпер тое месца ў двары СШ N 3 выглядае так, як вы бачыце на здымку справа.

Што ж, былы кумір сапраўды знік, прычым — цалкам і, трэба думаць, усур’ёз. А новы на помнік пакуль “не зарабіў”.

ТЫДНЁВІК прызнае сваю непрадбачлівасць. І ўсё ж-такі, здаецца, мелі мы рацыю. Бо дыктатура “нагалову”, як зараз у нас, не можа балансаваць працяглы час. Яна альбо ўсталёўваецца “крэпка” і пануе ў поўны рост, альбо пад ціскам супольных сілаў Дабра знікае назаўсёды (як раптоўна знік наш Ільіч).

Таму тое, што адбылося ў школьным двары ды яшчэ напярэдадні навучальнага года — добры знак. Бо ў любой справе галоўнае — так лічыў, прынамсі, нават сам Ільіч — гэта пачатак...

ПАД ВОРШАЙ МЫ СТАЛІ БЕЛАРУСАМІ

Пaступовы рух за адраджэнне сваёй Бацькаўшчыны набірае моц і на Магілёўшчыне. Цяжкая шматпакутная гісторыя беларускага народу, знішчэнне яго мовы і культуры прывялі амаль да поўнага заняпаду нацыянальнага жыцця, нашых традыцый, да жахлівага стану грамадства і скалечаных лёсаў мільёнаў людзей. Сёння час адрадзіць наш край. Гэта справа нашай годнасці і сумлення. І таму кожны год 8-га верасня патрыёты Бацькаўшчыны прыносяць прысягу на вернасць свайму народу і краіне.

...У Магілёве гэта адбылося ў 1991 годзе. Тады цэлая дэлегацыя патрыятычна настроенай інтэлігенцыі і моладзі Магілёва, арганізаваная суполкай "Машэка" і мясцовай філіяй БНФ, прыняла ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных угодкам славутай бітвы пад Воршай, дзе ў 1514 годзе беларускія ваяры ўшчэнт разбілі шматпераўзыходзячыя орды маскоўскіх захопнікаў, тым самым заклаўшы пачатак "залатога веку" ў нашай гісторыі. Пад Воршай на Крапіўненскім полі мы, беларусы, упершыню трымалі сваю прысягу на вернасць Радзіме, упершыню адчулі адказнасць за будучыню сваёй дзяржавы. Тут, пад Воршай, мы сталі беларусамі.

8 верасня 1991 года сталася пачаткам нашай новай традыцыі — святкавання Дня беларускай вайсковай славы, Дня нашага гонару. Традыцыя адразу сталася важным чыннікам у

рускіх патрыятычных сілаў у змаганні за стварэнне свайго беларускага войска, адстойванні нашай незалежнасці. Але далейшыя падзеі, звязаныя з правядзеннем свята, паказалі, што наперадзе яшчэ нялёгкі шлях. Адзначым толькі тое, што не павінна забыцца.

1992—1993 г.г.

Нягледзячы на перашкоды ўладаў святочныя мерапрыемствы пад Воршай зноў наладжваюцца мясцовымі патрыятычнымі арганізацыямі. Устанаўліваецца мемарыяльны знак за пераможцаў у вялікай бітве. Магілёўская філія БНФ арганізуе ўдзел у святце сяброў, зьяўляецца адным са спонсараў фэстывалю патрыятычнай песні.

1994 г.

Упершыню свята з нагоды Дня беларускай вайсковай славы праводзіцца ў Магілёве. Зьязджаюцца прадстаўнікі дэмакратычных арганізацыяў вобласці. Месцам правядзення абіраецца старажытнае гарадзішча побач Палаца школьнікаў. Але ўлады не даюць дазволу і ўжо напачатку свята спрабуюць арыштаваць яго арганізатараў. Адбываюцца сутычкі з міліцыяй. Патрыёты рашуча бароняць сяброў. У гэты ж момант яны прымаюць клятву і ставяць свае подпісы пад тэкстам прысягі. Палымяныя словы выступоўцаў, аздобленыя выкананнем песні "Людзі ўзрушаныя" дапамагаюць удзельнікам адчуць гонар і павагу да сябе. Такое не забываецца.

Патрыятычнае свята напалохала ўладу. Пытанне аб правяд-

славы ў Магілёве нават выносіцца на чарговую сэсію гарадскога Савету, адбываецца кампанія ашэльмоўвання свята ў афіцыйных СМІ. У выніку ледзь не ствараецца адмысловая дэпутацкая камісія для... высвятлення законнасці дзеянняў службовых асобаў і супрацоўнікаў праваахоўных органаў падчас правядзення святочных мерапрыемстваў. Але часы ўжо не тыя: краінай кіруе Лукашэнка.

1995 г.

У апошні раз праходзіць святкаванне Дня беларускай вайсковай славы пад Воршай. Уладамі зроблена ўсё, каб свята не адбылося. Сарваны канцэрт знакамітых беларускіх рок-гуртоў, — адключана асвятленне. Затрымліваюцца тыя, хто накіроўваецца на свята. Але яно ўсё-такі адбываецца. Магілёўцы бяруць у ім удзел.

1996 г.

Чарговая забарона на свята ў Магілёве. Апэляцыі ў вышэйшыя дзяржаўныя і судовыя інстанцыі выніку не даюць. Таксама забараняецца правядзенне мерапрыемстваў пад Воршай. Але ў Магілёве збіраецца група патрыётаў і ўскладае кветкі ў гонар загінуўшых абаронцаў горада. Зноў гучаць натхнёныя словы і патрыятычныя песні. А гэта значыць, што жыве беларускі дух і нашае змаганне за сваю будучыню працягваецца.

А.ФЁДАРАЎ,
старшыня Рады абласной філіі БНФ

НАПЯРЭДАДНІ ПАДЗЕІ

“МАЛАДЫ ФРОНТ”: ПАЧАТАК

*Наш карэспандэнт **АЛЕСЬ ТАБОЛІЧ** пабываў на пасяджэнні аргкамітэту па падрыхтоўцы ўстаноўчага Сойму вядомай маладзёжнай арганізацыі. Вось што ён перадаў у гэты нумар ТМ.*

На сённяшні час "Малады Фронт" —самая дзейсная маладзёвая структура горада Менска. Новае пакаленне беларускіх патрыётаў — гэта жывая крыніца цікавых ідэй, накіраваных на прыцягненне ў свае шэрагі таленавітай моладзі. Сапраўды, трэба, каб маладыя адчувалі сябе патрэбнымі сваёй беларускай краіне. Маладафронтаўцы займаюцца не толькі палітычнай, але і культурніцкай дзейнасцю. Наладжваюць вандроўкі, летнікі, канцэрты, дыскатэкі і г. д. Сярод сяброў МФ шмат юнакоў і дзяўчат з розных ВНУ, якія добра ведаюць гісторыю, культуру, эканоміку і палітыку нашай краіны, ад даўніны да сучаснасці. Будучыя гісторыкі, эканамісты ды мастакі маюць і агульную мэту: спрыяць адраджэнню Бацькаўшчыны. Іх аб'ядноўвае любоў да ўсяго нацыянальнага: мовы, сымбаляў, сваіх каранёў у самым шырокім эўрапейскім кан-

І-шы ўстаноўчы Сойм МФ павінен адбыцца 6-га верасня ў Менску. Чакаецца прыезд каля тысячы дэлегатаў з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама гасцей з замежжа. Удзельнікі Сойму маюць на мэце стварыць моцную арганізацыю пад агульным назовам "Малады Фронт" з цэнтрамі ў Менску, Гародні і Магілёве. Сойм абярэ старшыню і сустаршыняў МФ, зацвердзіць Статут і сымболіку арганізацыі.

На 7-ае верасня на плошчы Якуба Коласа запланаваныя "рыцарскі турнір" і выступленне беларускіх бардаў у памяць славутай бітвы пад Воршай (8 верасня 1514 г.). Пакуль Мінгарвыканкам даў дазвол на правядзенне акцыі.

Такім чынам, маладзёжны нацыянальна-дэмакратычны рух жыве і набірае моц. Новае пакаленне свядома аддае перавагу дэмакратычнай незалежнай краіне. І нарэшце Беларусь такой стане, бо інакш про-

ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ

Мне нравится защищать людей

АЛЛА НИКОЛАЕВНА ДАНИЛИНА — человек в области известный. Все, кто ее знают, отмечают в ней много замечательных качеств и черт, которыми ее щедро наградила природа и которые она сама в себе воспитала. Среди них — энергия и коммуникабельность, которые не просто привлекательны сами по себе, но и важны в ее работе. Она —председатель обкома профсоюза работников химической промышленности, который по численности уступает, пожалуй, только профсозу работников сельского хозяйства. Недавно еще Алла Данилина была и председателем региональной организации женской партии "Надежда". Но оставила это занятие, поскольку профсоюзная деятельность, по закону, несовместима с партийной. Однако политический контекст, в котором мы все живем, всегда в поле ее зрения и всегда находит отражение в работе. На той точке зрения, что женщина должна занимать все большее место в общественной и политической жизни страны, она твердо стоит по сей день. По ее мнению это во многом помогло бы лучше решать многие проблемы. В том числе те, с которыми Алла Николаевна сталкивается по работе каждый день. С этого мы и начали беседу.

— Недавно были опубликованы данные социологического опроса о доверии людей различным структурам. Социологи поинтересовались и отношением к профсоюзам. Традиционным профсоюзам сегодня доверяет почти 26% опрошенных, свободным — более 28%. Не доверяют соответственно — 54 и 32 процента. В чем, на ваш взгляд, причина такой, мягко говоря, нелюбви к официальным защитникам трудящихся?

— Честно говоря, я не сторонник обсуждения этой темы по линии: кто лучше, а кто хуже. Все зависит от психологии человека, его взглядов и даже от внутреннего эмоционального состояния. В наших традиционных профсоюзах, надо признать, есть определенный застой. У нас многие функционеры дорабатывают до пенсии, в работе у них много инерции. Поэтому мы сейчас много делаем для того, чтобы обновиться. Во вновь избранных профсоюзных органах и структурах сейчас почти на треть — новые молодые люди.

Что касается свободных профсоюзов, то у меня к ним жёсткое отношение. И по личному опыту, и по знанию ситуации в зарубежных профсоюзах. Я считаю, что профсоюзы должны существовать по отраслям и по предприятиям, не делясь на конкурирующие. Альтернативные организации внутри отрасли или предприятия ничего хорошего не несут. По-моему, законодательство, которое это допускает, неправильно.

— Но ведь была причина возникновения свободных профсоюзов.

— Я вижу в этом две причины. Всегда есть невостребованные люди. Их по разным причинам в коллективах не замечают, не ценят их активности, инициативы. А тут появилась возможность смело высказываться, выступать. Вот на митингах они и проявились, сумели собрать вокруг себя других обиженных людей или тех, кого сумели увлечь яркими речами. А вторая причина в том, что есть люди, которые считают, что можно изменить систему, саму власть и для этого можно использовать и профсоюзы. Но я не доверяю этим людям. У профсоюзов совсем другие задачи и цели, здесь должны работать подготовленные люди, а не просто яркие ораторы.

Разделение профсоюзов — большая ошибка. На этом в свою пользу играет государство. Это с одной стороны, а с другой, — я никогда не пойду на площадь, если не увижу смысла этой акции. К тому же и альтернативные профсоюзы не избавлены от "бюрократических устремлений". Когда они пришли к нам на комбинат, то первое, с чего начали — это заинтересовались кабинетом, машиной, льготами. Конечно, без этого работать структуре нельзя, но все же главное — чтобы менялось мышление и был результат. Я сторонник переговоров, поиска компромисов. Хотя характер у меня бойцовский, я люблю и умею воевать. В частности, с консерватизмом.

— В стране нарастают авторитарные тенденции. Смогут ли государственные профсоюзы избежать давления?

— Сложный вопрос. Надо полагать, что действие, которое не совпадает с действием государственных структур всегда вызыват давление. А с другой стороны, властная рука и должна властвовать. Другое дело, как властвовать.

Например, у нас забрали вопросы оздоровления людей. Бесспорно, что это государственная функция, и мы понимали, что ее надо будет возвратить государству. Но более половины наших членов считает это преждевременным, а к ним не прислушались. Это не очень мудро, ведь любое решение надо объяснить, сделать его сторонниками большинство, а не рубить с плеча. Нельзя не знать и не учитывать мнение людей. Это неразумно. Надо искать компромисы, идти на переговоры. Тогда и будет меньше острых ситуаций, в которых никто не заинтересован.

— Ну, а когда мудрости не хватает у тех, кто руководит, Вы чувствуете в себе готовность противостоять нажиму?

— Мне довольно часто приходится это делать. Это моя работа, моя должностная и человеческая позиция.

— Не потому ли Ваше имя было в числе кандидатов на избрание в Верховный Совет? Или Вы чувствуете в себе задатки политика?

— Нет, я пожалуй не скажу о себе, что я политик. Профсоюзная работа, мне кажется, совпадает с моим характером и интересами. Мне нравится защищать людей. Во всех смыслах: интеллектуальном, законодательном, житейском.

Политики тоже призваны защищать людей, но я знаю, сколько в политике агрессивности, борьбы за место, сколько жестокости. А мне нравится другой образ мысли и действий. Но когда меня выдвинули кандитатом, я не могла отказаться, потому что и люди мне верили, и в законодательном органе должны быть женщины. И хоть я не депутат, до сих пор ко мне приходят люди, которые узнали меня в избирательную кампанию, и верят мне. Не всегда могу оказать помощь. И это бывает очень горько. А вот по своей профсоюзной линии не отступаю, пока не помогу человеку, если он справедливо нуждается в поддержке.

Беседовала Саша Гжельская.

Я защищаю конкретного человека

*Активистов Свободных профсоюзов в нашем городе знают не только журналисты, госпрофсоюзные коллеги, но и милиция. Тот же мой собеседник — **СЕРГЕЙ ИВАНОВ** немало доставил хлопот блюстителям белорусского правопорядка, участвуя в митингах, пикетах, голодовках. Ему приходилось отстаивать перед начальством и в судах свои интересы, но чаще — интересы других.*

Сегодня он, зам. председателя региональной организации Свободных профсоюзов, больше всего внимания уделяет безработным. Испытав, не по своей воле, конечно, что это такое — быть безработным, он руководит теперь в городе клубом безработных с оптимистичным названием "Поиск". Клуб работает при Свободных профсоюзах и уже одно это могло бы оправдать их существование. Но кроме того, СПБ ведет огромную работу по защите прав человека в их и непосредственном и в широком смысле слова.

Штаб профсоюзов и клуб вместе занимают однокомнатную квартиру в жилом доме. Естественно, нет ни одной транспортной единицы, а скромная оргтехника — подарок зарубежных коллег.

— Как оказались Вы в СПБ, что привело в его ряды?

— Сначала я работал, или лучше сказать, состоял в "советско-государственных" профсоюзах. Меня избрали в начале 90-х годов председателем цехового профсоюза на молочном комбинате. Цехком наш начал во все вникать, всем интересоваться. Администрация, не долго думая, приняла привычное для себя решение: меня уволили. Но время было на дворе все-таки другое. За восемь месяцев борьбы мне удалось восстановиться на работе. За это же время многое передумал, на многое посмотрел иначе, многое понял. Считаю свой приход в Свободный профсоюз естественным. Начал работу с создания "свободной первички" на своем комбинате. Кончилось моим увольнением. Однако для восстановления на работе теперь мне понадобилось две недели. Свободный профсоюз показал, что силен не только на митинге, но и в деле.

— Ваш оппонент в сегодняшней газетной дискуссии считает, что от разделения профсоюзов выигрывает администрация, а не рабочие. А Вы как думаете?

— Мы с государственными профсоюзами не боремся, конфронтация не является нашей целью. Мы представляем отдельного человека, который обращается к нам за помощью, когда от него отворачивается профсоюз официальный, чтобы не портить отношений с администрацией. Давно сложилось так, что госпрофсоюзные работники считают себя частью администрации, а не рабочего коллектива. Мы же поняли совсем другое: профсоюз — защитник рабочих, их представитель перед работодателем. Никакого заигрывания здесь не должно быть. Так всем легче и понятнее. И самой администрации, и рабочим.

Вот один из недавних примеров. Рабочего на молочном комбинате принудили заключить контракт сроком на один месяц, а по его истечении "на законном" основании уволили. Госпрофсоюз промолчал, что контракт не может быть меньшим, чем на 4-е месяца. Мы заступились за рабочего, и приказ об увольнении был отменен. Правда, на это пришлось потратить много времени и сил.

— А тем не менее, согласитесь, в СПБ рабочие не идут массами. Почему?

— Люди попросту боятся. Чтобы придти к нам, надо побороть перед начальством и государством свой страх, который за многие годы советско-коммунистической власти стал почти генетическим. К тому же многое делается со стороны и сегодняшней власти, чтобы этот страх вернуть и даже закрепить. Каждый, кто состоит в нашем профсоюзе, ежедневно испытывает на себе давление администрации, официального профсоюза, непонимание друзей, а иногда и семьи. Это трудное испытание.

— Можно очень долго ждать, пока люди прозреют...

— Мы пассивно не ждем. Ведем агитационную и просветительскую работу. Начали выпускать свой Информационный бюллетень. А главное, продлжаем конкретно помогать конкретным людям. В месяц у нас, как правило, 2-3 суда. Мы участвуем в них, не привлекая профессиональных адвокатов. И средств нет на это, и адвокатов смелых немного, и самим надо учиться стоять за себя. Для этого изучаем законы, я, например, начал изучать юриспруденцию. Профессиональным юристом будет вскоре и наш председатель Сергей Ободовский. Нам удается теперь выигрывать до 70-и процентов дел, за которые мы беремся.

— Наверное, поэтому вас стали чаще обвинять в "политике", в оппозиционности, в "смыкании" с Белорусским Народным Фронтом?

— В свой адрес нам многое приходится слышать. Не стану скрывать, и даже горжусь тем, что в наших рядах немало людей, настроенных твердо демократически. Многие наши рабочие, и это отрадно, начали видеть дальше своего рабочего места. Сама жизнь заставляет если не становиться политиками, то понимать политику и заниматься ею в меру сил. Иначе, как справедливо говорится, она займется тобой, тебя не спрашивая и не принимая во внимание. Уважающий себя человек должен быть патриотом страны, демократом, назависимой личностью.

Можно быть таким у себя дома тихонечко. Но для блага страны, счастья детей и внуков таким надо быть открыто. Если Свободные профсоюзы влияют на то, что таких людей становится у нас больше, мы не против. Обвинения в "политике", в связях с оппозицией, в занятии "не своим делом" переживем. Главное, чтобы был результат.

Беседовала Саша ГЖЕЛЬСКАЯ.

Не ўсе грамадоўцы пагадзіліся з "новым курсам" сваёй партыі



Унутраны канфлікт у беларускім сацыял-дэмакратычным руху, у якім некаторы час назад перамог "новы курс" сп. Статкевіча, мае скончыцца заўтра на ўстаноўчым зьездзе Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады. Найбольш паслядоўныя грамадоўцы, што адпачатку не згадзіліся з палітычнымі і арганізацыйнымі навацыямі статкевічскага сацыял-дэмакратычнага Саюза, пакінулі, як вядома, ягоныя шэрагі разам з С.Шушкевічам і А.Трусавым (на здымку). Далейшыя палітычныя падзеі ў краіне прывялі іх да высновы, што нельга дапусціць страты высокіх ідэяў беларускай Грамады, якія пакінулі адметны след у нашай гісторыі. Ініцыятары паўторнага адраджэння гэтай палітычнай арганізацыі ў найноўшай гісторыі Беларусі правялі неабходную падрыхтоўчую працу каб склікаць новы ўстаноўчы зьезд. На гэтым шляху ім давялося пераадоліць нямала перашкод, якія чыніліся не толькі ўладамі, але і ўчарашнімі паплечнікамі.

Зьезд павінен адбыцца ў Менску заўтра. Мы не можам прадбачыць, што і як на ім будзе. Хаця ТМ, са свайго боку, жадае грамадоўцам поспеху ў справе аднаўлення сваёй партыі, без якой палітра беларускай рэчаіснасці не поўная, а поле змагання за нацыянальна-дэмакратычную дзяржаву менш шырокае, чым павінна быць.

У якасьці своеасаблівага прывітання зьезду ТМ друкуе дакумент, што стаўся платформай аб'яднання грамадоўскіх дэмакратаў. Нам яго прадаставіў былы вядомы дэпутат Вярхоўнага Савета Станіслаў Бабачонак з надзеяй, што многія магілёўцы зацікавяцца Грамадой, а тыя, хто адыйшоў ад яе падчас унутранага расколу, вернуцца ў шэрагі партыі на новым вітку гісторыі — як яе самой, так і нашай краіны.

РЭДАКЦЫЯ.

Праграма-мінімум

Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады

на перыяд надзвычайнага становішча

Уступ

Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада (БСДГ) працягвае традыцыі заснаванай ў 1903 годзе Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады, Беларускай Сацыялістычнай Грамады, Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Работніцкай Групы, Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Партыі і абапіраецца на вопыт беларускага і сусветнага сацыял-дэмакратычнага руху.

Становішча ў краіне

Беларусь знаходзіцца ва ўмовах панавання аўтарытарнага рэжыму, што ўсталяваўся ў выніку дзяржаўнага перавароту, а вераломна ўведзеная так званая канстытуцыя 1996 года не спалучаецца з дэмакрытыяй, правамі чалавека, падзяленнем і незалежнасцю галін улады.

Стан беларускай эканомікі катастрафічны. Усе афіцыйныя заявы кіраўніцтва выканаўчай улады аб стабілізацыі і нават павелічэнні валавага ўнутранага прадукту — хлусня. Людзі бяднеюць, а многім і на выжыванне не хапае ні сродкаў, ні сіл.

Палітычныя рухі і партыі, прафсаюзы, грамадскія арганізацыі і сродкі масавай інфармацыі пазбаўлены магчымасці нармальна працаваць, бараніць інтарэсы народа.

Першасныя задачы

Першая галоўная задача БСДГ — аднавіць дзеянне Канстытуцыі 1994 года —асноўнага Закона для пабудовы прававой незалежнай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь.

Мы лічым неабходным зрабіць усе магчымыя захады для аднаўлення павагі да Беларусі ва ўсім свеце як да цывілізаванай дзяржавы, на тэрыторыі якой пануе закон і гарантуецца захаванне і абарона правоў чалавека і грамадзяніна.

Штодзённыя задачы

БСДГ бароніць інтарэсы чалавека працы, замагаецца за паважлівае стаўленне да людзей, працуючых па найму, за справядлівую аплату іх працы і дастойную пенсію.

БСДГ кіруецца ў сваёй дзейнасці Праграмай, прынятай на II зьездзе БСДГ 20 снежня 1992 года ў тых яе частках, якія не закрануты ў дадзенай Праграме-мінімум.

БСДГ працуе над удасканаленнем Праграмы і зацвердзіць яе на чарговым зьездзе.

Адным характарам праблему не рашыць

У краіне пагаршаецца сацыяльна-эканамічная сітуацыя. Растуць цэны і беспрацоўе. На вуліцах усё часцей можна сустрэць п'яных людзей. Усё большае тых, хто адкрыта жыве на зборы посуду, папрашайніцтве і дробным крадзяжы. Карыстаецца папулярнасцю ідэя, што грошы можна зарабляць толькі злачынным шляхам.

Возьмем наш Магілёў. Не так даўно, па мерках грамадскай памяці, тут было здзейснена некалькі "чыкагскіх" забойстваў. Нядаўна пасярод белага дня ў цэнтры горада хтосьці абстраляў "іншамарку" з аўтамабіля, які потым быў знойдзены спаленым. У Кастрычніцкім раёне, у більярднай адбылася рэзня. Злачынцы спрабавалі "падштурхнуць" кіраўніцтва аб'яднання "Хімвалакно" да таго, каб ім дазволілі рэалізоўваць прадукцыю прадпрыемства.

Калі колькасць злачынстваў за паўгода ў некалькіх раёнах вобласці зменшылася, дык у самім Магілёве — павялічылася ажно на 11 адсоткаў. На горад прыпадае трэць цяжкіх злачынстваў, з якіх каля паловы да гэтага часу не раскрытыя.

Гэтыя ды іншыя факты гучалі на апошнім паседжанні гарвыканкама. Нярэдка сярод прычынаў, якія прывялі да такога становішча, называлася дрэнная кадравая палітыка, вынікам якой зьяўляюцца выпадкі непрафесіяналізму супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Напрыклад, у Цэнтральным раённым аддзеле, якім кіруе палкоўнік Церахаў, пракуратура выявіла 15 спробаў ухілення ад уліку фактаў злачынстваў. Ёсць выпадкі, калі міліцыянты беспадстаўна збівалі людзей, якіх затрымлівалі па сваіх настроях.

Кіраўніцтва гарвыканкама патрабавала ад упраўлення ўнутраных спраў спыніць рост злачыннасці. Аднак УУС падпарадкоўваецца аблвыканкаму і ў першую чаргу выконвае яго распараджэнні. Апошняя па часу спроба стварыць гарадскую міліцыю належыла папярэдніку Д.Сівіцкага Сяргею Габрусеву. Цяперашні мэр не ідзе так далёка, аднак рэзкая крытыка абласнога міліцэйскага ўпраўлення можа не прайсці для яго безвынікова. У той жа час за парадак у горадзе найперш адказвае ён, і гэта вымушае старшыню гарвыканкама час ад часу дэманстраваць "характар", што, вядома, кардынальна вырашыць праблему не ў стане.

АЛЕСЬ СЕРДЗЮКОЎ.

ЧАРНОБЫЛЬ — БЕЛАРУСЬ: ХТО КАГО ПЕРАМОЖА?

Дзяўчынка пра радыяцыю і ня чула

Зараз усё менш гавораць пра Чарнобыль, пра бяду, што абрынулася на нас, і пра жыццё людзей у забруджанай зоне. Улады стараюцца не афішаваць праблемы, з якімі яшчэ сутыкаюцца тысячы нашых суграмадзян. Нават знаходзяцца такія блюзнэрцы, якія кажуць, што ў забруджаных раёнах можна спакойна жыць і працаваць, бо ніякай радыяцыі там няма, або яна моцна зменшаная прафілактычнымі мерамі.

Касцюковічы — мястэчка, якое ляжыць прыкладна ў 180 км ад "афіцыйна" забруджанай зоны. Зразумела, што ніякіх "чарнобыльскіх" ільготаў для яго жыхароў не прадугледжана. Але вось такі прыклад з жыцця.

"У 1988 годзе ў мяне нарадзілася дзіця, — распавядае мясцовая жыхарка Валянціна, — і з гэтай пары мы адразу сталі ахвярамі чарнобыльскай катастрофы. Дзіця адразу ж захварэла на цэлы "букет" чарнобыльскіх хваробаў. Вось ужо дзевяць год мы цягаемся па розных лякарнях, намагаючыся ўжо не вылечыць, а хаця б трохі аблегчыць жыццёвы лёс сваёй дачкі. Нас вельмі здзіўляюць абыякавыя адносіны ўрачоў раённай і абласной лякарняў. Яны кажуць, што з гэтымі хваробамі можна жыць, што яны не такія жахлівыя. А між тым дзяўчыне патрабуецца штопаўгода лячыцца ў стацыянары. Зараз мы едзем са шпіталю, дзе, я спадзявалася, дачка застанецца падлячыцца, але яе не здолелі там прыняць. Дзяўчына, я лічу, павінна быць звольненая ад фізкультуры, але дзеля гэтага я таксама мусіла старацца ў Магілёве, ды нічога не выстарала, бо Касцюковічы не належаць да "афіцыйна забруджанай зоны".

Я спытаўся ў Валянціны ці не спрабавала яна адправіць дзяўчынку за мяжу, каб яна там падлячылася.

"Гэта немагчыма, — працягвала яна. — За мяжу ад нашага раёна ездзяць альбо дзеці чыноўнікаў, альбо, зрэдку, са шматдзетных сем'яў. Пра нас жа ня можа быць і гаворкі. Сям'я ў нас звычайная, ва ўладзе ніхто не працуе, а сваіх сродкаў на такую паездку ў нас з мужам не стае..."

На маю думку, гісторыя Валянціны і яе дачкі — гэта адзін з тых сумных адгалоскаў агульнай праблемы, што паўстала пасля Чарнобыля перад тысячамі беларускіх маці. Замоўчванне наступстваў атамнай аварыі, фактычная забарона на выказванне пратэсту супраць сённяшняга становішча — сапраўдны здзек з усіх грамадзянаў рэспублікі. Нашую краіну, дзе наступствы атамнай аварыі закранулі амаль кожную сям'ю, проста неабходна было абвесціць **краінай, пацярпелай ад выбуху.** Гэта ня позна зрабіць зараз, каб дабіцца ад вінаватых кампенсацыі ўрону, што быў нанесены народу і прыродзе. І каб не вымагаць ад беларусаў "патрыятычнага" жыцця там, дзе жыць недапушчальна.

Сяржук ГІРКІН.

P.S. Калі хто захоча і зможа дапамагчы згаданай дзяўчынцы выехаць на аздараўленне за мяжу, то для гэтых добрых людзей я пакідаю яе адрас у рэдакцыі.



Усёй бы краінай — за парты такой школы

Час ад часу грамадства нашай краіны, не гаворачы аб яе кіраўніцтве, палохае, здзіўляе, а тое і смешыць свет. Хаця смешнага мала ў тым, што адбываецца ў Беларусі. Шмат трывожнага. Днямі ў Мінску нават на дазволеную ўладамі дэманстрацыю ў падтрымку П.Шарамета і Д.Завадскага — а насамрэч яе трэба было б разглядаць як акцыю ў абарону саміх сябе — прыйшоў толькі адзін з амаль 2-х тысячаў жыхароў сталіцы.

Палітычная і грамадская абыякавасць, непатрэбнасць свабоды, непавага да святых правоў чалавека, што сталіся адметнымі якасцямі нашых людзей пасля прыходу да ўлады цяперашняй адміністратыўнай каманды, правакуюць гэтую ўладу на ўсталяванне ў цэнтры Еўропы небяспечнага рэжыму без рызыкі сустрэць унутраны супраціў. Грэбаванне ў нас правамі чалавека з маўклівай і рабскай згоды людзей можа прывесці краіну да жахлівых паследкаў, якія, не дай Божа, акажуцца падобнымі на трагедыю сталінскіх часоў.

Не хочацца верыць, што і казаць... Аднак тыя, хто займаецца правамі чалавека прафесійна, сведчаць: ужо сёння можна прывесці шмат прыкладаў небяспечнага татальнага наступу беларускіх уладаў на самыя неад'емныя правы чалавека. Сярод іх права на дастойнае жыццё, свабоду слова, дэманстрацый і сходаў, на палітычную і грамадскую дзейнасць, на дакладную і ўсебаковую інфармацыю і г.д.

Аб гэтым, дарэчы, вялася нядаўна гаворка ва ўкраінскім Данецку на занятках летняй Міжнароднай школы па правах чалавека, якую скончылі пасланцы 12-ці краінаў. Сярод іх быў старшыня абласной арганізацыі Свабодных прафсаюзаў **Сяргей Абадоўскі**. Ён выказаў нашай рэдакцыі сваю надзею на тое, што з дапамогай дэмакратычных арганізацый у Магілёве таксама з'явіцца падобная адукацыйная ўстанова. Людзі нашыя абыходзяцца без карыстання сваімі правамі яшчэ і таму, лічыць сп. Абадоўскі, што проста аб іх ня ведаюць.

Зразумела, што праблему нельга вырашыць толькі з дапамогай асветы, аднак асновы адпаведных ведаў трэба закладваць у чалавека з самага дзяцінства, як гэта робіцца ў цывілізаваных краінах. Такую даходлівую, цікавую і наглядную методыку і вывучалі абітурыенты Данецкай школы, якую паспяхова скончыў і наш магілёўскі грамадскі актывіст. Застаецца толькі зрабіць набытае агульным здабыткам. Сяргей Абадоўскі мае намер гэтым заняцца.

Уласная інф.

НА БЯЛЫНІЦКА-БІРУЛІНСКІМ ПЛЕНЭРЫ

На парозе блакітнай вясны

Пяць год існуе адзіны ў Магілёве беларускамоўны аматарскі тэатр пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча культуры Беларусі Валянціна Ермаловіча.

У рэпертуары тэатра — з поспехам прайшоўшыя пастаноўкі: "На чорных лядах" Васіля Быкава, "Хто смяецца апошнім" Кандрата Крапівы, "ПФХ" Леапольда Радзевіча, "Салдат і яго жонка" Максіма Гарэцкага, "Пан міністр" Францішка Аляхновіча ды іншыя.

У гэтым годзе тэатру прысвоена званне Народнага. Свой чарговы сэзон — першы ў новай якасці — тэатр распачаў прэм'ерай спэктакля "На парозе блакітнай вясны" Міхася Карпечанкі. Твор распавядае пра жыццё і дзейнасць славутага мастака В.К.Бялыніцкага-Бірулі.

Прэм'ера адбылася 28 жніўня ў Бялынічах, у рамках міжнароднага мастацкага пленэра. Вобраз мастака натхнёна перадаў сам пастаноўшчык В.Ермаловіч. Дарэчы, Бялыніцкага-Бірулю ў маленстве сыграў самы малады акцёр трупы —дзвюхгадовы Ігарок Пушкін. Ролю бацькі — Каэтана — выканаў І.Пушкін, дачку мастака сыграла Т.Пушкіна, Марыю Патапаўну — Р.Галушка. Выканаўца ролі Лявона, вучня мастака, Ю.Саковіч уразіў гледачоў цудоўнымі спевамі рамансаў, Я.Клімуць яскрава перадаў вобраз партыйнага функцыянэра.

Прэм'еру цёпла віталі аўтар твора М.Карпечанка, даследчык жыцця Бялыніцкага-Бірулі пісьменнік В.Карамазаў, удзельнікі пленэра і зайздросная для нашага часу вялікая колькасць гледачоў з ліку мясцовага насельніцтва.

ТАЦЦЯНА КРУКОЎСКАЯ.

Самі сабе капаем магілу?

Мясцовая філія БНФ перадала ў рэдакцыю ліст магіляўчаніна Леаніда Балубаева, які мяркуючы па змесце паслання, згубіў надзею атрымаць разуменне сваёй трывогі ў іншых установах і арганізацыях. На гэтай падставе мы спадзяемся, што аўтар не будзе супраць таго, што ягоны ліст пабачыць свет у газеце, стане здабыткам галоснасці. Тым больш, што тэма сапраўды вартая грамадскай увагі. Чытайце.

Вот уже год, как мною ведется неустанная борьба с различными инстанциями страны. Но только Институт радиационной медицины поддерживает меня. Остальные — Совет Министров, Министерство по чрезвычайным ситуациям, Депутатская палата, Президент — не проявляют к проблеме должного интереса и ответственности.

Я отработал 5 лет в зоне отселенных населенных пунктов, чьи подворья подлежат захоронению. Это происходит без всякой защитной подготовки. Иными словами, вся радиактивная грязь, сгребаемая в котлованы, только присыпается землей. Ее размывают дожди, радиактивные элементы попадают в грунтовые воды. Через 15-20 лет все это проявится в новой вспышке заболеваний, отравит землю, растения, животных.

На мой взгляд, все это делается, чтобы показать работу, а не для того, чтобы спасти нашу Беларусь. Надо прекратить варварские захоронения, которые никому не нужны. Эти захоронения — потеря огромных средств, которые лучше бы направить на оздоровление людей. А такую работу по глубокой ликвидации последствий радиактивной беды надо проводить технологически правильно, качественно и ответственно. Не однажды слышал в ответ, что захоронения делаются, потому что брошенные поселки разворовываются, растаскиваются. А ведь они заражены! Но ведь заражены и леса, и торфяники. Их же не захороняют.

Значительно дешевле обеспечить контроль, не допустить вывоза чего бы то ни было с брошенных территорий, чем своими руками копать могилу для всех нас, кто доживет, и для наших детей-внуков. Ведь и сейчас на дорогах стоят посты. Если не могут остановить воровство, то за что им платят?

Необходимо всем поднять голос против сегодняшних работ по захоронению в радиационной зоне. Без надежных саркофагов-замков эта работа и бесполезна, и даже преступна.

Болубов Леонид Зиновьевич.

З абвесткі Кансысторыі Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы

Паміж 1-м і 10-м верасня г.г. Першагерарх БАПЦ Я.М.Мітрапаліт Ізяслаў наведае Кіеў на запросіны Яго Свяцейства Патрыярха ўсяе Украіны Філарэта 1-га.

Ахвочыя сустрэцца з Мітрапалітам Ізяславам у Кіяве й зацікаўленыя быць сведкамі гэтай падзеі павінны зьвяртацца па далейшую інфармацыю ў:

Киівський Патріархат УПЦ
м. Киів, вул. Пушкіньска, 36. Украіна 252004
Тэл. (044) 224-10-96, або (044) 224-30-55.

ДА ТЫДНЁВІКА звярнуліся прыхільнікі газеты "Наша Ніва", якія, выконваючы просьбу яе супрацоўнікаў, прапанавалі нам змясціць у адным з нумароў інфармацыю пра тое, дзе і як можна набыць беларускія кнігі ды аўдыёкасэты. Так, "Наша Ніва" заснавала Беларускі Гуманітарны Фонд, які вядзе такую патрэбную ўсім нам працу па распаўсюджванню твораў нацыянальнай літаратуры ў галінах філасофіі, культуралогіі, паэзіі, гісторыі... "Запас" нашых школьных ды ўніверсітэцкіх ведаў савецкіх часоў не дае, як вядома, аніякага ўяўлення пра Беларусь, пра яе гісторыю, пра самую яе наяўнасць у свеце. Пасля скону бальшавіцкай імпэрыі многія людзі асэнсавалі гэтую сваю амаль поўную дэнацыяналізаванасць. А дзе ж набыць неабходныя веды, калі ПРАЎДА ўжо колькі дзесяцігоддзяў не друкавалася наогул? — гэтае пытанне часта даводзіцца чуць і супрацоўнікам нашай рэдакцыі.

Ініцыятыва "Нашай Нівы" па стварэнню БГФ і тое, што яны робяць — гэта сапраўдны прарыў у накірунку "людзьмі звацца" і "быць Янкамі, а не Іванамі, ня ведаючымі сваёй радні". ТЫДНЁВІК, з прычыны невялікага фармату газеты, не ў стане цалкам перадрукаваць тую інфармацыю пра кнігі й касэты, што змяшчае ў сваім кожным нумары "НН". Таму мы адсылаем усіх цікаўных да самой "Нашай Нівы" — легенды нашага друку, сапраўднай беларускай газеты, якая выходзіла напачатку стагоддзя і была адноўленая ў 1991 годзе.

"НН" выходзіць у Менску па панядзелках, а ў Магілёве бывае звычайна праз дзень-другі. А вось даведка для аматараў беларускай рок-музыкі і бардаўскай песні: у Менску, па вул. Веры Харужай, 19, у музычным аддзеле крамы "Трыкатаж" стала прадаецца прадукцыя з асартыменту "НН".



КРУГОВАЯ ОБОРОНА: НА ЗАПАДЕ И ВОСТОКЕ

Если говорить о прессе, то нет, видимо, более запутанного понятия, чем "независимая пресса". Любой из вариантов: "негосударственная пресса", "свободная пресса" —гораздо точнее, потому что ближе к истинному положению вещей. Тем не менее, в тех же СМИ определение "независимая" прижилось повсеместно. Что и говорить —звучит гордо!

Вот и автору этих строк довелось принять участие в семинаре под названием "Независимая местная пресса в Беларуси и Польше: сравнение". Он приходил с 22-го по 25-е августа в Молодечно на базе местной "Рэгіянальнай газеты" при поддержке варшавского Института демократии в Восточной Европе (IDEE). Были приглашены практически все издатели и редакторы белорусской местной независимой прессы, за исключение минчан. Набралось порядка тридцати человек. Наряду с такими старожилами как "Пагоня" (г. Гродно), брестский и витебский "Курьеры", имеющими солидный стаж и внушительные тиражи под 30 и более тысяч экземпляров, учиться уму-разуму приехали представители более "мелких" газет и порой только начинающих самостоятельную жизнь. Как, например, "Тыднёвік Магілёўскі".

Это был один из редких семинаров, когда именно делу было отдано время, а не "потехе". График учебы — сверхжесткий. С 9-и утра до 9-и вечера с часовым перерывом на обед и четырьмя 15-и минутными паузами. Такой серьезный подход диктовался необычайно широкой гаммой вопросов, обсуждавшихся на семинаре. С одной стороны, они касались всей технологии издания газеты, с другой — привязывались к конкретной ситуации, как экономической, так и политической, в которых приходится выживать независимой белорусской прессе. Благо, что преподавателями были не теоретики университетской закваски, а польские коллеги-редакторы региональных газет, которые на своей "шкуре" испытали все "прелести" свободного рынка и знали не понаслышке о том, чему собирались учить. Два симпатичных молодых парня: Ежи Каминьский и Доминик Ксенский. Редакторы еженедельников "Олавские ведомости" и "Палуки" соответственно. Тиражи в перенасыщенной прессой стране довольно велики, по 7 тысяч экземпляров. Да еще в цвете и на 24-х полосах формата А3. Вид у обоих изданий, без преувеличения, европейский. И за всем этим, как принято говорить, стоит огромный труд и личная инициатива вкупе с изобретательностью. Начав в 90-х с двухполосок (!) и двухтысячного тиража, через 7 лет напряженной работы они имеют то, что имеют. Полны оптимизма и веры в собственные силы.

Бесспорно, у них перед нами было и есть одно огромное преимущество: им никто не мешал делать газеты такими, какими они хотели их видеть. Пусть не помогали, но и не запрещали, не выгоняли из типографий, не пугали закрытием за "клевету" в адрес властей. И хотя они не с неба свалились и понимают, в какой атмосфере приходится работать их собратьям по перу из соседней страны, — иногда их советы вызывали в аудитории смех. Вроде: "Если вам не нравится типография — поменяйте ее на другую". Видимо, почувствовав к исходу второго дня семинара, что надо внести ясность, польская сторона устроила диспут на тему: "Может ли опыт польской прессы быть использован белорусской местной прессой?"

Три часа обсуждения "болячек" принесли обоюдную пользу. Поляки четко уяснили — чему имеет смысл уделить повышенное внимание: концепции построения газеты, рекламной политике, маркетингу. А белорусы убедились в том, что проблемы есть у всех. В частности, нам сообщили, что местную польскую прессу "на корню" скупают норвежские и немецкие финансовые группы. Есть регионы, где под патронаж иностранного капитала перешло до 70-и% региональных изданий. И этот процесс набирает обороты. Впрочем, нечто похожее происходит и на белорусском газетном рынке, который заполонили даже не русскоязычные, а просто российские издания. Координатор программ института IDEE по Беларуси Павел Казанецкий отметил, что контраст с ситуацией, наблюдавшейся еще три-четыре года назад, разительный. Пройдя по центру Минска, он насчитал не менее пяти киосков, торгующих исключительно российской периодикой. Эта проблема, наравне с гражданской позицией наших журналистов — особенно в части выбора языка — как-то незаметно затмила все остальные вопросы, предлагавшиеся к дискутированию. Черту, довольно своеобразную, подвел все тот же Павел Казанецкий. Он сделал следующее предложение: "Давайте будем защищать нашу общую историю и культурные традиции. Мы - с Запада, а вы — с Востока". На том и порешили.

Если оценить целесообразность проведения таких семинаров, то их польза — налицо. Наши соседи ушли неизмеримо дальше нас как в области технологии издания газет, так и по части профессионального отношения к делу. В информационности, в компьютеризации, интенсивности труда, в эффективности и разнообразии функций, которые выполняет каждый член редакции. Словом, нам есть над чем думать и чему учиться.

А самый главный итог семинара заключается в том, что наши польские коллеги убедительно доказали истину: безвыходных ситуаций не бывает. Нужно только различать и учитывать "все стороны медали". Закончу отчет о семинаре анекдотом, к месту рассказанным Домиником Ксенским: "Одна английская фирма, выпускавшая ботинки, отправила своего агента в Африку, чтобы на месте оценить перспективы сбыта. Агент через месяц прислал сообщение, что перспектив никаких, поскольку здесь никто не ходит в ботинках. Фирма для контрольной проверки направила следом второго агента. Через неделю получила от него сп. телеграмму: здесь отличные перспективы, никто в ботинках пока не ходит".

Сергей ШИШКИН.

Магілёўшчына — край беларусаў

Так. Аб гэтым пераканаўча сведчаць дарэвалюцыйныя дадзеныя.

Праўда, згодна першага ўсеагульнага перапісу Расійскай імперыі (1897 г.), пэўная частка карэннага насельніцтва Магілёўскай губерні страціла свае нацыянальныя рысы. Таму кажучы аб колькасным складзе той ці іншай нацыянальнасці, маем на ўвазе колькасць размаўляючых на мове той ці іншай нацыянальнасці...

Згодна статыстыкі 1897 года 82,39% жыхароў губерні размаўлялі на беларускай мове, на другім месцы —габрэі (12,07%), далей рускія — 3,45%, палякі — 1,04. Сярод іншых нацыянальнасцей узгадваюцца украінцы, літоўцы, латышы, немцы, цыгане, эсты.

Разглядаючы размеркаванне нацыянальнасцей па паветах, бачым, што беларусаў найбольш жыло ў Чавускім і Чэрыкаўскім паветах (89,6% і 89,6%), найменш у Гомельскім і Магілёўскім паветах (74,08% і 69,89%). Рускіх было адносна шмат (9,67%) у Гомельскім павеце, дзе знаходзілася мястэчка Ветка. У ім жыло шмат рускіх раскольнікаў. Больш ці менш высокі працэнт рускіх быў у Магілёўскім (5,62%) і Клімавіцкім (5,35%) паветах. Габрэі складалі другую па колькасці, апасля беларусаў, групу насельніцтва ва ўсіх паветах губерні. Менш за ўсё іх было ў Сенненскім павеце (7,76%), а найбольш у Магілёўскім (21,94%). Сярод гарадскога насельніцтва іх было больш за 50% (52,37%), а ў вёсцы крыху болей 7% (7,49%). Даволі шмат палякаў жыло ў Сенненскім і Аршанскім паветах (2,36% і 1,78%).

Хто быў кім у 1897 годзе

Беларусы, украінцы і літоўцы ў Магілёўскай губерні ў пераважнай большасці былі сялянамі (адпаведна 93,5%; 84,88% і 91,69% ад агульнай колькасці асоб той ці іншай нацыянальнасці). Трэба памятаць, што беларусы складалі найбольшы працэнт усяго насельніцтва губерні. Сярод беларусаў яшчэ вылучалася катэгорыя мяшчан (5%), а усіх астатніх (шляхты, святароў, купцоў) было меней за 2% агулам.

Даволі шмат было сялян і сярод рускіх (51,47%). Сярод іх было багата і мяшчан (31,02%). Уражваюць лічбы — колькі сярод рускіх было святароў, прадстаўнікоў шляхты асабовай (гэта ў асноўным чыноўнікі, атрымаўшыя шляхецтва за заслугі перад расійскім урадам), патомнай шляхты (атрымаўшай маёнткі пасля падзей 1772 года) —адпаведна 4,17%, 4,60% і 6,11%.

У габрэяў большасць складалі мяшчане (95,41%), потым ішлі сяляне (2,77%) і купцы (1,56%).

Сярод палякаў унушальнай зьяўляецца колькасць патомнай шляхты (38,43%), крыху меней было мяшчан (29,46) і сялян (27,48%).



Пакуль тыя калгасы нас накормяць...

Магілёў: даўніна і сучаснасць

Гістарычны агляд Ігара ПУШКІНА





...А галоўны прыз — здароўе

Запрашаем прыняць удзел у IX міжнародных спаборніцтвах па спартоваму арыентаванню "Мэмарыял Уладзімірава". Яны адбудуцца 26-28 верасня 1997 г. у раёне в. Палыкавічы. Узрост удзельнікаў — ад 10-ці да 50-ці гадоў. Пераможцаў чакаюць цікавыя прызы (за першыя месцы ў групах Н-21 і Д-21 —дзвюхкасэтныя магнітолы). Будзе прапанаваны таксама конкурс-латарэя на лепшы слоган аб "Coca-Cola".

Генеральны спонсар турніру — "Coca-Cola".

Рэгістрацыя: 25-26 верасня ў Цэнтры турызма (вул. К.Лібкнехта, 7).

Тэлефон для даведак: 22-05-93, Ігар Драздоў.

Хто быў найбольш пісьменным

У Магілёўскай губерні найбольш пісьменнымі былі мужчыны як у паветах, так і ў гарадах. Адпаведна 22,92% і 54,81% у мужчын і 5,94% і 35,45% у жанчын (ад агульнай колькасці насельнітцва).

Самы высокі працэнт пісьменных быў сярод мужчын-гараджан ва ўзросце ад 10 да 19 год (74,51%), для параўнання ў паветах (43,10%). Далей ішлі гараджане — 30-39 год (68,43%) і 20-29 год (68,21%). Найменш пісьменнымі былі людзі ўзросту 60 год і болей як сярод мужчын, так і жанчын (53,07% і 20,36% у гарадах, 12,06% і 3,91% у паветах).

Больш пісьменнымі былі і жанчыны-гараджанкі: 10-19 год (56,75%, у паветах 10,59%),20-29 год (52,59%,у паветах 9,68%), 30-39 год (40,74%, у паветах 6,4%).

Калі параўноўваць лічбы пісьменнасці і адукаванасці паміж саслоўямі, бачна наступнае. Найбольш пісьменным зьяўляецца саслоўе святарства (80,15% мужчын і 71,78% жанчын), на другім месцы замежныя падданыя (62,79% і 62,50%), на трэцім месцы шляхта (62,99 і 53,50%). Сярод ганаровых грамадзян назіраецца нераўнамернасць лічбаў пісьменных жанчын і мужчын (29,04% і 48,52%). Але яшчэ большая нераўнамернасць у вясковых саслоўяў, дзе пісьменнасць жанчын меншая за мужчынскую ў 8 разоў. Пісьменнасць жанчын у вёсцы складала 2,44%, але ж яны былі больш схільныя да атрымання адукацыі вышэй пачатковай (0,77% пры 0,47% у мужчын).

Працэнт асоб, атрымаўшых адукацыю вышэй пачатковай, у губерні быў нязначны — 3,49% усіх пісьменных мужчын і 5,3% усіх пісьменных жанчын.

Сярэднюю адукацыю найбольш атрымлівала святарства (70,42% мужчын і 30,45% жанчын), універсітэцкую —шляхта (5,94% мужчын).

Якую мову за родную лічылі магілёўцы

Самы вялікі працэнт сялян у губерні ў 1897 г. складалі беларусы (96,14%), рускіх сялян было ўсяго 2,22%, яшчэ менш было сялян габрэяў — 0,42%, палякаў 0,36% і г.д. Беларусаў было таксама шмат і сярод святарства ўсіх хрысціянскіх канфесій (61,16%). Уражвае і лічба (52,38%) патомнай шляхты, якая лічыла сябе беларусамі. Прычым пры перапісе яны называлі беларускую мову роднай. Між святарства высокі працэнт рускіх — 37,86%. Другое месца сярод патомнай шляхты займалі палякі (30,48%). Далей ішлі рускія — 16,08%, якіх найбольш было між шляхты асабовай (47,92%).

На першым месцы сярод мяшчан былі габрэі (66,54%), потым ішлі беларусы (23,81%), рускія (6,18%), палякі (1,77%), латышы (1,07%), украінцы (0,12%).

Купецкае саслоўе амаль цалкам складалася з габрэяў (90,79%), між імі губляліся рускія (5,81%) і беларусы (2,54%). На ўсе астатнія нацыянальнасці прыходзілася ўсяго 0,86% усіх зарэгістраваных купцоў.

Рэдактар Генадзь СУДНІК





Інфармацыйна-аналітычная газета, заснаваная Магілёўскай гарадской асацыяцыяй "КОЛА СЯБРОЎ".

Зарэгістравана ў Дзяржкамітэце Рэспублікі Беларусь па друку за № 831.

Газета выходзіць па пятніцах, пераважна на беларускай мове..





АДРАС РЭДАКЦЫІ: 212030 г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.



ТЭЛЕФОНЫ: 31-04-15, 22-97-82

Газета набрана і надрукавана афсетным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.М.Свярдлова. Зак. 18. Тыраж 2100 асобнікаў.